✓У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі **8 лютага** адбылася **прэзентацыя двух выданняў, прысвечаных Буквару**. Першая ў свеце кніга пад назвай «Буквар» была выпушчана беларускай друкарняй больш за 400 гадоў таму. Выдавецтва «Беларусь» сёлета выпусціла фундаментальную працу Алеся Сушы «Беларускі Буквар», у якой шырока прадстаўлена тысячагадовая гісторыя галоўнай кнігі для навучання грамаце: ад старажытнасці і з'яўлення пісьменства ў Беларусі ажно да нашых дзён. На падставе тысяч архіўных і апублікаваных крыніц з розных краін (Аўстрыі, Вялікабрытаніі, Германіі, Даніі, Ірландыі, Італіі, ЗША, Латвіі, Літвы і інш.) атрымалася паказаць, па якіх падручніках вучыліся нашы продкі, як пачынаўся шлях да ведаў розных пакаленняў беларусаў, якія сімвалы і вобразы ўкладваліся ў змест пачатко-

вай адукацыі ў мінулым. Багата ілюстраваная кніга «Вынаходства Буквара ў Беларусі» таксама аўтарства А. Сушы выдадзена ў серыі «Беларуская дзіцячая энцыклапедыя». У ёй у даступнай форме можна даведацца пра першыя кнігі, якія не толькі садзейнічалі навучанню грамаце, але і выхаванню агульначалавечых каштоўнасцяў. З яе можна даведацца пра галоўныя сімвалы народа і адметнасці нацыянальнай культуры, а таксама здабыткі і дасягненні дзяржавы.